К.С. КАРНЯЛЮК

# МАСТАЦКІ СІНТЭЗ У АЎТАБІЯГРАФІЧНАЙ ТРЫЛОГІІ ЯКУБА КОЛАСА "НА РОСТАНЯХ" (1923, 1927, 1954)

Исследуются эпическое, лирическое и драматическое проявления в автобиографической трилогии Я. Коласа «На росстанях». Определяются место и роль этого произведения в процессе становления творческой индивидуальности писателя.

The article studies the epic, lyrical, dramatic traits revealed in the autobiographical trilogy by Y. Kolas «At the Crossroads». The place and role of this literary work in the formation of the writer's creative individuality are determined.

Трылогія "На ростанях" уяўляе сабой канцэнтраванае ўвасабленне найбольш характэрных для Коласа-празаіка прыёмаў, спосабаў апавядання, якія распрацоўваліся пісьменнікам на працягу ўсяго жыцця. Таму зразумела, чаму многія літаратуразнаўцы (А. Адамовіч, Дз. Бугаёў, В. Жураўлёў, В. Каваленка, А. Лойка, І. Навуменка, А. Семяновіч, Л. Сінькова, А. Яскевіч, М. Тычына, Т. Дасаева, В. Ляшук і інш.) імкнуліся вызначыць асаблівасці мастацкай структуры кнігі. Тым не менш, нягледзячы на існаванне шэрага прац, у якіх так ці інакш закранута праблема мастацкага сінтэзу, гэта пытанне з'яўляецца хутчэй абазначаным, чым вырашаным. Аўтарскае ўспрыняцце аўтабіяграфічнай трылогіі як "кнігі вынікаў", як твора, што ўвабраў у сябе лепшыя прыёмы пабудовы мастацкага тэксту, дазваляе спадзявацца, што выбраны аспект артыкула дапаможа вызначыць найбольш важныя дамінанты творчасці пісьменніка. Месца Коласа ў нашым духоўным жыцці такое значнае, а коласаўская канцэпцыя чалавека такая прынцыповая ў гісторыі беларускай літаратуры, што яе канкрэтызацыя і ўдакладненне заўсёды будуць садзейнічаць канкрэтызацыі і ўдакладненню ўяўлення пра Коласа як духоўнага настаўніка нацыі. Феномен коласаўскай творчасці далёка выходзіць за межы "канчатковых рашэнняў" сучаснага літаратуразнаўства. У з'яве "проза Коласа" заключана цікавая супрацьлегласць – спалучэнне яе прастаты з пастаянным патрабаваннем паэта глыбокай думкі.

Аналіз жанрава-стылёвай структуры трылогіі дае нам падставы сцвярджаць, што эвалюцыя стылю Коласа праходзіла пад знакам узмацнення мастацкага сінтэзу. Стылю празаіка ўласціва паэтычнасць бачання свету, сплаўленая з тонкім псіхалагізмам і пластычнасцю малюнка. У аснове трылогіі – роздум пра чалавека, народ, Радзіму, паказ пакутлівых пошукаў інтэлігенцыяй, Лабановічам – чалавекам уражлівай душы і высокіх духоўных парыванняў – шляхоў да служэння свайму народу. Паказваючы "біяграфію адной душы", пісьменнік змог разгарнуць шырокую панараму жыцця.

Эпічная па свайму жанраваму характару трылогія вызначаецца тонкім лірызмам, багаццем і яркасцю фарбаў "жывога жыцця", асабліва сялянскага і настаўніцкага асяроддзя, малюнкаў роднай прыроды. Эпіка і лірыка ў творы спалучаюцца настолькі арганічна, натуральна, што ствараецца поўнае ўражанне шматграннасці жыцця. І ў тым, як успрымае рэчаіснасць сам Лабановіч, пэўным чынам раскрываецца цэласнасць і гарманічнасць яго натуры. З выяўленнем характару гэтага героя звязана якасць псіхалагізму – псіхалагізму інтэлектуальнага, які праўдзіва перадае ўсю гаму адчуванняў і разнастайных пачуццяў, багацце і рухомасць эмацыянальнага жыцця Лабановіча, складанасць і актыўнасць яго адносін да рэчаіснасці, глыбіню яго духоўных інтарэсаў. Характэрнай асаблівасцю кампазіцыі твора з'яўляецца наяўнасць лірычных аўтарскіх адступленняў. Яны служаць не толькі сродкам раскрыцця духоўнай эвалюцыі галоўнага героя, але і выяўляюць аўтарскую ацэнку тых ці іншых з'яў і падзей. Нярэдкія выпадкі, калі назіраецца зліццё ці пераход лірычных аўтарскіх адступленняў у пейзажныя малюнкі, і наадварот.

Т.М. Дасаева заўважыла: “Лірызм адыграў выключную ролю ў станаўленні Коласа-празаіка, быў тым мастацкім сродкам, які выяўляў прыкмету нацыянальнай ментальнасці, узмацняў індывідуальны пачатак у творчасці пісьменніка” (Дасаева 2002, 8).

Эмацыянальнае супрацьпастаўленне імклівага руху, актыўнага дзеяння і раўнадушнага, соннага спакою вызначае ўнутраны канфлікт трылогіі. Сутыкненне гэтых кантрастных настрояў драматызуе і ўвесь твор, і асобныя яго эпізоды. Канфлікт паміж персанажамі таксама ўзнікае на аснове сутыкнення дзвюх жыццёвых тэндэнцый: мяшчанскага раўнадушша, эгаістычнага абмежавання душы дробязна-бытавымі інтарэсамі і вялікага ўздыму духу, імкнення ў будучыню. Душа Лабановіча ўся ў гарэнні, у пакутлівых пошуках. Таму ў яго ўзнікаюць спрэчкі і канфлікты з такімі людзьмі, як Саханюк. Лабановіч адчувае сябе сапраўдным чалавекам тады, калі пераадольвае ўласны канфлікт з жыццём, гэта значыць змяняе яго.

Надзвычай здзіўляе багацце інтанацый коласаўскай прозы, іх рухомасць, тонкасць пераходаў ад лірычнай узнёсласці да хітравата-іранічнага апавядання, пераключэнні з тону высокага на нізкі, з плана лірычнага ў бытавы. І. Навуменка канстатуе: “Мастацкі сінтэз, цэльнае, непасрэднае светаўспрыманне – найбольш характэрны момант у стылі пісьменніка. Прычына перавагі мастацкага сінтэзу над аналізам, відаць, у тым, што творчасць па духу вельмі блізкая да народнага светаўспрымання” (Навуменка 1981, 4).

Лабановіч і яго аднадумцы, такія як Садовіч, Тукала, пададзены ва ўзаемаадносінах з другімі людзьмі: гэта пісары, іх памочнікі, папы, фельчары, ляснічыя, канфліктам з якімі і абумоўлена логіка развіцця характару Лабановіча, яго духоўная эвалюцыя. Кладучы ў аснову прозы канфлікты сацыяльнага жыцця, супрацьпастаўляючы носьбітаў сацыяльнай несправядлівасці і людзей працы, пісьменнік пераносіць сацыяльныя супярэчнасці са сферы знешніх адносін у сферу духоўнасці, унутранага жыцця герояў.

На думку Ю.С. Пшыркова, “да стварэння эпасу ў прозе Я. Колас прыйшоў узбагачаны вопытам працы над эпасам у паэзіі, а г. зн., што і як паэт, і як празаік ён мысліў катэгорыямі шырокага філасофскага плана і адлюстроўваў жыццё ў паэтычных вобразах абагульняючага значэння” (Пшыркоў 1982, 5). Канфлікт першай кнігі трылогіі развіваецца ў плане маральна-этычных узаемаадносін. Супярэчнасці заключаюцца ў тым, як разумеецца шчасце і якімі дарогамі трэба ісці да яго, якімі прынцыпамі кіруюцца людзі. Сам Лабановіч знаходзіцца ў драматычных абставінах: згадзіцца з разуменнем сэнсу жыцця мясцовай інтэлігенцыі азначала ісці іх сцежкамі. Дарэчы, сам метад псіхалагічнага аналізу ў Коласа блізкі да тургенеўскага: празаік паказвае знешнія праявы пакутлівых унутраных перажыванняў, адкрывае тое, што кожны можа заўважыць. Так, працэс фарміравання характару Ядвісі застаўся па-за нашай увагай, празаік паведамляе толькі яго вынікі.

Коласаўская традыцыя ўвасабляе багаты, высокапрафесійны вопыт напісання буйных і яркіх эпічных твораў, дзе думка і пачуццё, форма і змест знаходзяцца ў глыбокай арганічнай суладнасці. Гэта традыцыя, якая глыбока ўвабрала ў сябе нацыянальны гісторыка-літаратурны патэнцыял і перадавы вопыт рускай літаратурнай класікі XIX ст. (у першую чаргу ідэйна-эстэтычны вопыт Пушкіна і Гогаля), не можа не звяртаць на сябе ўвагу, бо яна зрабіла сапраўдны пераварот у сферы раманнай паэтыкі і наогул у сферы ўсёй мнагастайнай сістэмы мастацкіх сродкаў і прыёмаў, якімі здольна было карыстацца беларускае эпічнае слова ў рэалістычным адлюстраванні жыцця.

В.П. Жураўлёў адзначыў, што для Коласа, як і для Дастаеўскага, спосаб “ажыўлення” эпічнага дзеяння займальнасцю быў у ліку дапаможных: “Галоўную ж энергію, якая павінна рухаць сюжэт і даваць яму свабоду, маштабнасць і дынамічнае разгортванне, пісьменнік шукаў не ў паверхневых

сферах прадметнай рэальнасці, а ў яе глыбінных асновах, імкнучыся паказаць кожную жыццёвую з'яву ў яе непаўторнасці і самацэннасці, выявіць яе ўнутраную ўзаемасувязь і ўзаемазалежнасць з цэлым" (Жураўлёў 1991, 2). Празаік і здолеў паказаць у канкрэтна-побытавым і адначасова алегарычна абагульненым адлюстраванні "ростаней", калі звычайная побытавая дэталь узнімаецца да значэння сімвалічнага вобраза, маральна-духоўны і псіхалагічны стан беларускага народа ў пачатку XX ст.

Эпічная канва, якая знаёміць з падзейным бокам адлюстраванага, неаддзельная ад паказу ўнутранага жыцця Лабановіча, унутранага дзеяння. У той жа час трылогія – самы лірычны твор Коласа. Замалёўкі прыроды нярэдка будуюцца па законах паэзіі. Яны вельмі эмацыянальныя, рытмічныя і – па прынцыпу кантрастнасці – падкрэсліваюць ідэйную дамінанту твора, яго гуманістычную накіраванасць. Лірычны пачатак як адна з форм суб'ектывацыі пісьма Коласа выконвае розныя функцыі: гэта як бы "дапаўненне" да эпічнасці, існуючага не разам з ім, часцей побач з ім; лірычнае ўздзейнічае на характар і асаблівасці эпічнага, ствараючы своеасаблівы тып ліра-эпічнага апавядання. І такім чынам, паэзіяй у яго стала "сама проза народнага жыцця" (А. Адамовіч).

Так, лірычнае адступленне пра беларускія старасвецкія шляхі выяўляе патрыятызм Коласа, яго знітаванасць з народам, роздум пра беларускі шлях, пра лёс Бацькаўшчыны. Яно з'яўляецца і своеасаблівым эмацыянальным уступам да размовы Лабановіча і Турсевіча пра паняволенасць Бацькаўшчыны, пра страту часткай беларускай інтэлігенцыі нацыянальнай годнасці. Нарэшце, лірычнае адступленне пра шляхі Беларусі – гэта яшчэ і пошукі Лабановічам сваіх шляхоў сумленнага жыцця і служэння народу. Лірычнае адступленне "Песня ляснога жаваранка" выконвае розныя функцыі: выступае сродкам характарыстыкі Лабановіча, здольнага так моцна аддавацца чарам прыроды. Гэта "песня" ўведзена пасля гасцявання Лабановіча і Садовіча ў Панямоні. Карціны прыроды кантрастуюць з панямонскім брудам, у які "вымazаліся" героі. Пачуўшы песню жаваранка, яны нібыта ачысціліся, зноў гатовыя да пошуку свайго прызначэння. Садовіч вырашае вяртацца на радзіму, у чым праявілася еднасць настаўнікаў да змагання. Адметнае і лірыка-публіцыстычнае адступленне "На прастор, на шырокі прастор!". Прастор тут выступае своеасаблівым сімвалам прадчування грамадскіх зрухаў. Трылогія – гэта, наогул, натхнёны гімн чалавеку-шукальніку і змагару, чалавеку, які ніколі не спыняецца ў сваім руху наперад, да ісціны, да шчасця для ўсіх.

Мы бачым, як сфера асэнсавання героем жыцця паступова пашыраецца з маленькай палескай вёсачкі Цельшына да мястэчка (Панямонь), потым да воласці (Выганы), да Пінска, а ў трэцяй кнізе – і да губернскіх гарадоў Мінска і Вільні. М. Бахцін справядліва адзначыў: "Дзякуючы эпічнай дыстанцыі, што выключае ўсялякую магчымасць актыўнасці і змен, эпічны свет і набывае тую выключную завершанасць не толькі з пункту гледжання зместу, але і з пункту гледжання яго сэнсу і каштоўнасці" (Бахтин 1975, 1).

Колас, як і Пушкін, стварае вобраз беларускай прыроды эпічнымі фарбамі, аднаўляючы "язычніцкі" погляд на свет, асаблівасцямі якога з'яўляюцца прастата, натуральнасць, цэласнасць бачання. У той жа час пейзаж напоўнены лірычным зместам. Эпічны сюжэт спакойнай плыні прыродных з'яў увесь час узрываецца выбухамі аўтарскіх пачуццяў. Колас знаходзіў у паэме "Яўгеній Анегін" узор спалучэння эпічнага і лірычнага погляду на радзіму: жывапісныя пейзажы змяшчаюць у сабе драматызм, які ўносіць у Сусвет час як адну з асноўных каардынат чалавечага існавання.

Трылогія нясе ў сабе мноства складаных праблем пачатку XX ст., закранае балючыя пытанні жыцця "людзей на балоце" (І. Мележ), палешукоў, дзейнасці перадавой інтэлігенцыі. Твор пазбаўлены аднаго – абыякавасці: ва ўсім адчуваецца несумненны талент мастака-жывапісца, знаўцы народ-

нага побыту. Колас-эпік сцвярджае тое вечнае, непарушнае, устойлівае ў жыцці і чалавеку, без чаго і чалавек не чалавек, жыццё не жыццё, як скажам, праўдзівасць, сумленне, працавітасць, духоўнасць; адмаўляе наноснае ў чалавеку. Вось характарыстыка дзеда Мікодыма: "...калі вынікала якая заблытаная справа агульнавясковага характару, злазіў з печы зусім стары ўжо дзед Мікодым, выходзіў на вуліцу і голасна зазначаў:

– Вы не думайце таго – праўда не скварка, з кашаю не з'ясі. Выйдзе наверх яна, родная, бо ўжо сама зямля прысягала небу не пускаць адгэтуль цёмнай, заблытанай праявы" (Колас 1975, 3).

Народнае сумленне ў трылогіі ўвасабляюць, напрыклад, бабка Мар'я, стары Мікіта, Грыгор, Сцяпан Рылка. З захапленнем слухае Лабановіч расказ аб старым Грыгоры, які адабраў у мядзведзіцы медзведзяня і прынёс яго з лесу. А ў вобразах школьных старожак бабкі Мар'і і бабкі Параскі раскрываюцца дабрыня, спагадлівасць, чуласць сялянскай душы, неабыякавасць да чужога гора. Пры раскрыцці характараў персанажаў мы сустракаемся і з працавітасцю, і з дабратой, і са сквапнасцю (успомнім хоць бы жаданне Саханюка завалодаць "гарцамі" Лабановіча), і з прагай да ўласнасці, і з "самажорствам", лагоднасцю і сварлівасцю, адкрытасцю і зацятасцю душы вясковага чалавека – надзвычай багатая жыццёвая гама ў празаіка. І пры гэтым, заўважым, ва ўсе праявы нацыянальнага характару Колас заглыбляецца псіхалагічна тонка, дакладна. Пісьменнік не дае гатовых рэцэптаў, не спяшаецца агулам асуджаць ці апраўдваць герояў, не ідэалізуе жыццё палескай, прынямонскай вёскі, далёкі ад таго, каб збіцца толькі на паэтычны паказ палескай прыроды, багацця палескага краю, Прынямоння.

Празаік і расказвае, і паказвае. Зліццё гэтых двух пластоў у трылогіі, на нашу думку, – адзін з моцных бакоў. Аўтар умела пазбягае аголена-публіцыстычнага выражэння думкі, не збіваецца на рыторыку, маралізатарства, не імкнецца да катэгарычнага, "лабавога" вырашэння праблемы, не спяшаецца выносіць свой прысуд.

Зразумела, што на трылогію аказаў уплыў прынцып сацыялістычнага рэалізму. Нават калі яшчэ ў друку пачалі з'яўляцца першыя ўрыўкі з аповесці "У палескай глушы", савецкая ўлада ўжо распачала змаганне з інтэлігенцыяй; другая аповесць "У глыбі Палесся" ствара̀лася ў перыяд, калі пачалі набіраць сілу жахлівыя працэсы, якія потым упарта вынішчалі лепшых сыноў і дачок Беларусі, калі слова "нацдэм" стала ўвасабленнем антыпатрыятызму, варожасці да свайго народа. Не трэба забываць, што гісторыя стварэння трылогіі – гэта і гісторыя вынішчэння нацыянальнай інтэлігенцыі, спыненая толькі на гады Вялікай Айчыннай вайны.

Трэцяя частка – "лебядзіная песня" (але гэтаму лебедзю наступілі на горла. – *К. К.*) стваралася ў канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг., калі ў СССР, Беларусі зноў распачаліся рэпрэсіі. Як цяжка, драматычна давалася пісьменніку апошняя частка "На ростанях", у якіх неспрыяльных грамадскіх умовах яна пісалася, сведчыць тое, што яна была скончана толькі незадоўга да смерці аўтара – у 1954 г. І дададзім, што самай галоўнай прычынай масавага расчаравання інтэлігенцыі была агульная атмасфера жыцця ў Савецкай Беларусі: папярэдняе "хаджэнне ў народ" не дало жаданых вынікаў. Трэцяя частка стваралася ва ўмовах, калі пісьменнік адчуваў ціск бальшавіцкай ідэалогіі: таму Колас вымушаны быў прывесці свайго "двайніка" – Лабановіча да бальшавікоў, да Галубовіча, каб менавіта ў іх знайсці тую "праўду", якую шукаў.

В.Я. Ляшук заўважыла, што "вобразам Андрэя Лабановіча, яго лёсам Якуб Колас пераканальна паказвае: гіпертрафіраванне аднаго напрамку ў шматграннай дзейнасці чалавека, у мнагалучнасці яго інтарэсаў, захапленняў міжвольна вядзе да непапраўных страт, да збяднення асобы. У гэтым плане трылогію... трэба ўспрымаць як засцярогу народнага пісьменніка са-

вецкаму грамадству, дзе галоўным і фактычна адзіным крытэрыем ацэнкі чалавека была яго грамадская функцыя" (Ляшук 2001, 7). Невыпадкова, што доўгія гады за інтэлігенцыяй у СССР быў замацаваны эпітэт "гнілая", яе выключалі з паняцця "народ". Гэты боль душы пісьменнік таксама вынес на старонкі галоўнай кнігі свайго жыцця -- трылогіі "На ростанях".

Андрэй Лабановіч стаў аб'ектам бясконцых нападак з боку вульгарызатарскай крытыкі другой паловы 1920-х гг.: у школах, тэхнікумах праводзіліся суды над Лабановічам як грамадскім дзеячам. І Колас, на жаль, быў вымушаны падпарадкоўвацца патрабаванням метаду сацыялістычнага рэалізму. Твор пісаўся ў час, калі панаваў вульгарны атэізм, калі святары таксама аб'яўляліся, як і нацдэмы, "ворагамі народа".

Аднак, як справядліва заўважыў М. Тычына, нягледзячы на немагчымасць гаварыць праўду пра свой час на поўны голас (многія імёны былі пад забаронай, замоўчваліся, спрашчалася карціна падзей), Колас усё ж змог паказаць тагачасныя падзеі, стварыць вобразы і характары людзей, якія ў той час жылі, пакутавалі, шукалі, змагаліся, сцвярджалі новае і адвяргалі састарэлае.

Ажыццяўляючы пошукі феномена нацыянальнага характару, пісьменнік удала выкарыстаў гістарычную эпоху для праекцыі мінулага і сучаснасці. Колас добра ўсведамляў, што менавіта ад эпічнай глыбіні ўзнятых гістарычных пластоў, шырыні іх распрацоўкі, таксама як і ад асваення праблем цяперашняга часу, залежыць узровень сталасці айчыннай прозы.

ЛІТАРАТУРА

Бахтин М.М. Вопросы литературы и эстетики. М., 1975. С. 461.
Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: У 4 т. Мн., 1999. Т. 1. С. 227.
Дасаева Т.М. Паэтыка лірызму ў беларускай публіцыстыцы і мастацкай прозе: Аўтарэф. дыс. ... д-ра філал. навук. Мн., 2002. С. 14.
Жураўлёў В.П. Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана. Мн., 1991. С. 94.
Колас Я. Збор твораў: У 14 т. Т. 9. Трылогія "На ростанях". Мн., 1975. С. 105.
Ляшук В.Я. Вывучэнне трылогіі Якуба Коласа "На ростанях" у школе. Мн., 2001. С. 77.
Навуменка І.Я. Якуб Колас: Духоўны воблік героя. Мн., 1981. С. 27.
Пшыркоў Ю.С. Летапісец свайго народа: Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа. Мн., 1982. С. 219.

Паступіў у рэдакцыю 12.12.2003.

*Канстанцін Сцяпанавіч Карнялюк* – выкладчык кафедры ўсходнеславянскай філалогіі і лінгвістыкі Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава.

*В.Ч. ГУРЛО*

# ПРАСТОРАВА-ЧАСАВАЯ БУДОВА РАМАНА ІНГЕБОРГ БАХМАН «МАЛІНА» (1971)

Исследуются особенности стилистики романа И. Бахман с точки зрения его пространственно-временной структуры. Выделяются сюжетное и социально-историческое время, а также субъективное время повествовательницы. Рассматриваются пространства взаимоотношений героев, вставной легенды и снов, автобиографическое пространство автора.

The article investigates stylistic peculiarities of the novel by I. Bachmann from the point of its special-temporal structure. In the article Action time and Socio-historical time as well as the Narrator's Subjective time are represented. Also considered are the space of the heroes' interrelation, the Author's autobiographical space and inserted legend and dreams.

Паэтыка твораў аўстрыйскай пісьменніцы Інгеборг Бахман (*Ingeborg Bachmann*, 1926–1973) на працягу апошніх дзесяцігоддзяў выклікае цікаўнасць літаратуразнаўцаў. Найчасцей вучоныя звяртаюцца да паэзіі Бахман, хаця і яе нешматлікія празаічныя творы (зборнікі апавяданняў «Трыццаты год» («*Das dreissigste Jahr*», *1961*), «Сінхронна» («*Simultan*», 1972), раман «Маліна» («*Malina*», 1971), безумоўна, заслугоўваюць увагі. Мы ў сваім артыкуле прааналізуем прасторава-часавую будову вышэйназванага рамана.